**Лясная гісторыя**

Аўтар: Анна Віткоўская
28.09.2014 01:00

“Бо ўвесь закон у адзін сказ укладваецца: любі бліжняга твайго, як самога сябе” (Гал 5, 14)  У адным лесе жылі ваверчаня Філя і зайчаня Кузя. Кожны меў свой любімы занятак: ваверчаня цэлымі днямі скакала па галінках дрэў, а зайчаня бегала па лесе і ласавалася заечай капустай. Яны не былі знаёмыя адзін з адным і, магчыма, ніколі б не пазнаёміліся, каб не здарылася з імі адна гісторыя.

Аднойчы раніцай, калі сонца толькі выходзіла з-за гарызонта, Філя вылез з дупла вялікага дрэва, каб паснедаць. Ён сядзеў, абапіраючыся на свой пухнаты рыжы хвост, і трымаў у пярэдніх лапах вялікую кедравую шышку. Кедравыя шышкі запоўнены смачнымі гарэшкамі, якімі вельмі любяць ласавацца вавёркі. Вось наш Філя як раз гэтым і займаўся. †  Ваверчаня так захапілася, што не заўважыла варону Клару, якая сядзела вышэй на дрэве.

– Смачна есці! – сказала Клара.

Філя падскочыў ад нечаканасці, і шышка выпала ў яго з лапак.

– Гэй, хто там шышкамі кідаецца? – пачуўся знізу чыйсьці абураны голас. – Ледзь гуз мне не набіў сваёй шышкай.

Філя паглядзеў уніз і ўбачыў шэрага зайчыка, што ляжаў у траве пад дрэвам. Як вы ўжо здагадаліся, гэта быў Кузя, які адпачываў пасля ранішняй прабежкі.

– Прабач, – збянтэжана сказала ваверчаня. – Я не ўдарыў цябе?

– Не, – буркнуў Кузя, здзіўлены выхаванасцю Філі.

– Мяне Філя завуць, – сказала ваверчаня. – Давай пагуляем, калі ты на мяне не пакрыўдзіўся.

– А я – Кузя, – адказала зайчаня. – А ў што мы будзем гуляць?

– У даганялкі, – прапанаваў Філя. – Заскоквай на дрэва, і будзем даганяць адзін аднаго.

– На дрэва? – перапытаў Кузя. – Я не ўмею скакаць па дрэвах. Лепш спускайся ўніз, пабяжым навыперадкі да таго старога дуба.

– Я дрэнна бегаю па зямлі, – сказала засмучанае ваверчаня, – мне перашкаджае мой хвост.

Кузя азадачана пачухаў лапай за вухам і сказаў з расчараваннем:

– Як шкада, што мы з табой не зможам пасябраваць.

– І мне вельмі шкада, – сумна адказала ваверчаня. – Мне б так хацелася мець сябра.

Аўтар: Анна Віткоўская
28.09.2014 01:00

[redacted]